# XXV З'ЕЗД ЛКСМБ

Акруговы Дом афіцэраў, 27 лютага. Пад скляпеннямі залы гучаць песні, якія ўслаўляюць родную партыю, гераічны савецкі народ. Яны ўваскрашаюць этапы вялікага шляху, слаўную гісторыю Ленінскага камсамола.

10 гадзін раніцы. Першы сакратар ЦК ЛКСМБ У. І. Падрэз аб'яўляе XXV з'езд Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі адкрытым.

У прэзідыум з'езда выбіраюцца таварышы П. М. Машэраў, А. Н. Аксёнаў, Ц. Я. Кісялёў, У. Е. Лабанок, У. Ф. Міцкевіч, М. Н. Полазаў, І. Я. Палякоў, А. А. Смірноў, Ф. А. Сурганаў, М. І. Лагір, Я. П. Нікулкін, У. І. Падрэз, І. М. Трацяк, сакратар ЦК ВЛКСМ З. Г. Наважылава, лётчык-касманаўт СССР, Герой Савецкага Саюза В. В. Гарбатко, сакратары ЦК ЛКСМБ В. І. Радомскі, К. М. Платонаў, Б. А. Саўчанка і Л. Н. Балошка, даярка калгаса «Пасека» Старадарожскага раёна Е. Н. Абашына, брыгадзір трактарнай брыгады саўгаса «Дружба» Кобрынскага раёна А. А. Багдановіч, цялятніца саўгаса «Судкова» Хойніцкага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы Е. Е. Вяргейчык, токар Брэсцкага электралямпавага завода Л. М. Дзяцел, ткачыха Аршанскага ордэна Леніна льнокамбіната, лаўрэат прэміі ВЛКСМ Г. П. Кобрусева, студэнтка Гродзенскага педынстытута, заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіёнка XX Алімпійскіх гульняў В. В. Корбут, кампазітар, лаўрэат прэміі ВЛКСМ І. М. Лучанок, брыгадзір комплекснай брыгады Гродзенскага будтрэста № 11 М. С. Слабыш і іншыя.

З вялікім уздымам выбіраецца ганаровы прэзідыум з'езда ў саставе Палітбюро Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Зацвярджаецца наступны парадак дня з'езда:

Справаздача Цэнтральнага Камітэта ЛКСМ Беларусі «Аб рабоце па выкананню рашэнняў XXIV з'езда КПСС, XVI з'езда ВЛКСМ і задачы камсамольскіх арганізацый па далейшаму паляпшэнню камуністычнага выхавання моладзі»;

Справаздача рэвізійнай камісіі ЛКСМ Беларусі;

Выбары Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ;

Выбары рэвізійнай камісіі ЛКСМБ.

Бурнымі апладысментамі сустрэлі дэлегаты і госці прывітанне Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі XXV з'езду ЛКСМБ, якое зачытаў сакратар ЦК КПБ У. Ф. Міцкевіч.

Са справаздачным дакладам Цэнтральнага камітэта камсамола Беларусі выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ У. І. Падрэз.

Даклад рэвізійнай камісіі ЛКСМБ зрабіў старшыня рэвізійнай камісіі В. І. Хоміч.

* * *

28 лютага працягваў работу XXV з'езд Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі. Дэлегаты абмяркоўвалі справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ.

Сакратар ЦК ВЛКСМ З. Г. Наважылава ўручыла камсамольскай арганізацыі рэспублікі пераходны Чырвоны сцяг ЦК ВЛКСМ за поспехі, дасягнутыя ў выкананні заданняў трэцяга, рашаючага года пяцігодкі.

З вялікай прамовай на з'ездзе выступіў другі сакратар ЦК КП Беларусі А. Н. Аксёнаў.

Затым з'езд аднагалосна прыняў рэзалюцыю.

Выбран новы састаў Цэнтральнага Камітэта Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі і рэвізійнай камісіі ЛКСМБ. З вялікім уздымам дэлегаты з'езда прынялі пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай Партыі Савецкага Саюза.

XXV з'езд ЛКСМБ ад імя камсамольцаў, усіх юнакоў і дзяўчат рэспублікі запэўніў Камуністычную партыю ў тым, што камсамол Беларусі — адзін з баявых атрадаў ВЛКСМ — будзе і надалей весці за сабой моладзь на працу і подзвіг у імя Савецкай Айчыны, што маладыя рабочыя і калгаснікі, усе юнакі і дзяўчаты з новай сілай пацвердзяць сваю вернасць неўміручым ленінскім запаветам, справе камунізму, ударнай працай і выдатнай вучобай азнамянуюць XVII з'езд ВЛКСМ, 50-годдзе з дня прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, унясуць дастойны ўклад у ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС,

З'езд аб'яўляецца закрытым. Дэлегаты і госці стоячы спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал».

Адбыўся пленум новага саставу Цэнтральнага Камітэта Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі, выбранага XXV з'ездам ЛКСМБ. Разгледжаны арганізацыйныя пытанні.

Пленум выбраў першым сакратаром ЦК ЛКСМБ У. В. Грыгор'ева. Сакратарамі ЦК ЛКСМБ выбраны В. І. Радомскі, К. М. Платонаў, Б. А. Саўчанка і Л. М. Балошка.

Пленум зацвердзіў загадчыкаў аддзелаў ЦК ЛКСМБ, рэдактараў маладзёжных газет і часопісаў. (БЕЛТА).

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 7 (179) | Субота, 2 сакавіка 1974 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## АГУЛЬНАЎНІВЕРСІТЭЦКІ ПАРТЫЙНЫ СХОД

27 лютага ў актавай зале ГДУ адбыўся агульнаўніверсітэцкі адкрыты партыйны сход, на якім абмеркавана пытанне аб ходзе выканання Пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 18 ліпеня 1972 года «Аб мерах па далейшаму ўдасканальванню вышэйшай адукацыі ў краіне» і задачах, вынікаючых з рашэнняў снежаньскага Пленума ЦК КПСС (1973 г.), Звароту Цэнтральнага Камітэта КПСС да партыі, да савецкага народа.

З дакладам на сходзе выступіў рэктар універсітэта, доктар фізіка-матэматычных навук **Б. В. Бокуць.**

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел старшыня партыйнай камісіі па кантролю дзейнасці адміністрацыі прафесар **Ф. М. Харытановіч,** дэкан геалагічнага факультэта, дацэнт **Ю. Ф. Хадакоўскі,** сакратар партыйнага бюро фізічнага факультэта **Т. П. Жалонкіна,** член парткома, рэдактар шматтыражнай газеты «Гомельскі ўніверсітэт» **У. П. Балога,** прарэктар па АГР **В. І. Конухаў,** начальнік штаба грамадзянскай абароны ўніверсітэта **Р. С. Мільчанка,** студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта, намеснік старшыні прафкома **Н. Колтышава,** намеснік сакратара партбюро гісторыка-філалагічнага факультэта **Р. С. Еўдакіменка,** дацэнт **С. А. Сафонаў.**

У рабоце партыйнага сходу прыняў ўдзел і выступіў сакратар Цэнтральнага райкома КПБ г. Гомеля **А. А. Гайдаш.**

На сходзе, справаздача аб якім будзе надрукавана ў наступным нумары нашай газеты, прынята разгорнутая пастанова, накіраваная на больш паспяховае выкананне Пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканальванню вышэйшай адукацыі ў краіне»» і павышэнне актыўнасці камуністаў універсітэта ў вырашэнні задач, вынікаючых з рашэнняў снежаньскага Пленума ЦК КПСС (1973 г.), Звароту Цэнтральнага Камітэта КПСС да партыі, да савецкага народа.

## У МЯСЦКОМЕ

У мінулы аўторак было праведзена пашыранае пасяджэнне мясцовага камітэта, на якім заслухан і абмеркаван шэраг надзённых пытанняў.

Са справаздачай аб выкананні плана навукова-даследчай работы ў 1973 годзе на кафедры палітэканоміі выступіў яе загадчык дацэнт М. М. Маёраў. Сакаклад па гэтаму пытанню зрабіў прафесар А. С. Калугін.

На пасяджэнні мясцкома прынцыповая размова адбылася аб паляпшэнні работы студэнцкіх сталовай і буфетаў.

Аб стане ваенна-патрыятычнай і ваенна-масавай работы, праводзімай камітэтам ДТСААФ, расказаў яго старшыня П. У. Жукаў.

Мясцком заслухаў інфармацыю аб выкананні плана збору прафсаюзных членскіх узносаў за два месяцы г. г., зацвердзіў графік водпускаў супрацоўнікаў універсітэта на 1974 год.

## ЧАКАЮЦЬ НАС БУДОЎЛІ ПЯЦІГОДКІ

Сёлета ў шаснаццаты раз будоўлі краіны будуць сустракаць студэнцкую моладзь.

Студэнцкі будаўнічы рух стаў слаўнай працоўнай школай. Непасрэдны ўдзел юнакоў і дзяўчат у ажыццяўленні народнагаспадарчых планаў, прынятых XXIV з'ездам КПСС, задач, пастаўленых у прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў, з'яўляецца важнай формай камуністычнага выхавання будучых арганізатараў вытворчасці.

У летнім семестры 1974 года студэнты нашага ўніверсітэта ў саставе 24 будаўнічых атрадаў будуць працаваць на сельскіх аб'ектах, меліярацыі Палесся, на ўдарных камсамольскіх будоўлях, у Казахстане, на сельгасработах Малдавіі. Як і ў папярэднія гады, лепшыя студэнты выедуць на працу ў Чэхаславакію.

Падрыхтоўчы перыяд атрадаў, іх фарміраванне ўскладае на камітэт камсамола, штаб працоўных спраў універсітэта, на ўсе камсамольскія арганізацыі факультэтаў вялікую адказнасць, бо ад гэтага будзе залежаць далейшы поспех. Неабходна стварыць высокадысцыплінаваныя атрады з добрымі маральна-палітычнымі якасцямі байцоў. У атрадах павінна быць не казарменная, але строгая, жалезная і разам з тым творчая дысцыпліна.

Цяпер вялікую ўвагу трэба звярнуць на прафесійна-тэхнічную падрыхтоўку, вывучэнне правіл тэхнікі бяспекі. Адной з важнейшых павінна быць таксама арганізацыйна-прапагандысцкая работа.

У падрыхтоўчы перыяд неабходна кожнаму атраду стварыць добрыя калектывы мастацкай самадзейнасці, лектарскія групы, спартыўныя каманды.

Паспяхова пачалася падрыхтоўка СБА на механіка-матэматычным, эканамічным і фізічным факультэтах. Аднак гэтага нельга сказаць пра геалагічны факультэт і факультэт фізвыхавання, дзе зацягваюць фарміраванне атрадаў.

У Звароце ЦК КПСС да партыі, да савецкага народа сказана, што наша выдатная моладзь з новай сілай пацвердзіць сваю вернасць ленінскім запаветам, справе камуністычнай партыі, азнаменуе чацвёрты год пяцігодкі ўдарнай працай і выдатнай вучобай.

Партыя і Радзіма вераць у маладое пакаленне, у яго працалюбства, настойлівасць і самаадданасць. Студэнты нашага ўніверсітэта глыбока ўсведамляюць гэта і поўны рашучасці ў новым працоўным семестры ўнесці дастойны ўклад у датэрміновае выкананне планаў дзевятай пяцігодкі.

**У. ДЗЮБО,**
**начальнік штаба працоўных спраў.**



**НА ЗДЫМКУ: студэнты трэцяга курса фізічнага факультэта на практычных занятках у лабараторыі ядзернай фізікі.**

## СВАІМІ ВАЧЫМА

На зімовых канікулах наша група пабывала ў Ленінградзе, аб гістарычных помніках, месцах, падзеях якога ведае ўвесь свет. План экскурсіі мы склалі яшчэ дома. Той велізарнай колькасці незабыўных уражанняў, якія там атрымалі, мы абавязаны свайму куратару І. К. Кекішу — арганізатару гэтай паездкі.

Жылі мы ў інтэрнаце Ленінградскага сельскагаспадарчага інстытута ў г. Пушкіне. Зусім недалёка ад нас размяшчаўся Екацярынінскі палац, таму сваё падарожжа па горадзе Леніна мы пачалі з гэтага палаца. Гэта адзін з цудоўнейшых помнікаў рускай архітэктуры XVIII стагоддзя.

Гледзячы на гэтыя выдатныя тварэнні мастацтва, наймацней адчуваеш і абураешся злачынствамі гітлераўскіх захопнікаў. У час вайны палац быў амаль цалкам разбураны, большасць экспанатаў вывезена і пашкоджана. Некаторыя нават да сённяшняга часу не знойдзены.

Шмат хто чуў пра гісторыю Янтарнага пакоя — унікальнейшы экспарт музея. Рэстаўрацыйныя работы вядуцца тут каля 30 гадоў, але зрабіць яшчэ застаецца больш.

Безумоўна, мы былі і ў Эрмітажы. Бачылі карціны вялікіх майстроў, з мастацтвам якіх былі знаёмы толькі па рэпрадукцыях. Як раз у гэтыя дні праводзілася выстаўка італьянскага жывапісу XVIII ст.

У адзін з дзён мы зрабілі экскурсію па гістарычных месцах горада-героя. Былі ў Смольным, на плошчы Дзекабрыстаў, на легендарным крэйсеры «Аўрора».

Асабліва вялікае ўражанне на нас зрабіла наведванне Піскараўскіх мемарыяльных могілак. Тут пахаваны ахвяры блакады і гераічныя абаронцы Ленінграда. Амаль паўмільёна чалавек. Тут ніколі не вянуць кветкі.

Шэсць дзён — гэта невялікі тэрмін, але мы паспелі пабываць і ў Рускім мастацкім музеі, дзе азнаёміліся з шэдэўрамі рускага жывапісу (найлепш спадабаліся карціны А. І. Куінджы «Вясёлка» і «Месячная ноч на Дняпры»), і ў Ісакіеўскім саборы, які здзіўляе мноствам залатых купалаў, каланадай, іканапісам. Былі таксама на экскурсіі ў Петрапаўлаўскай крэпасці.

Пашчасціла паглядзець спектакль Л. Жухавіцкага «Адзін, без ангелаў» у Дзяржаўным акадэмічным тэатры драмы імя А. С. Пушкіна, балет «Медны коннік» у Дзяржаўным тэатры оперы і балета імя С. М. Кірава...

Аб Ленінградзе, аб яго гістарычным мінулым, сённяшнім, будучым можна расказваць бясконца. Але недарэмна кажуць: «Лепш адзін раз убачыць, чым сто раз пачуць».

**В. КРУЧКОВА,**
**студэнтка чацвёртага курса эканамічнага факультэта.**

# ПАЎНЕЙ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ МАГЧЫМАСЦІ

**ДА ВЫНІКАЎ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ ЗА 1973 ГОД.**

**М. В. НАВУЧЫЦЕЛЬ, прарэктар па навукова-даследчай рабоце, прафесар.**

У мінулым годзе ва ўніверсітэце працягваўся працэс станаўлення і развіцця навуковых даследаванняў. Работа гэта вялася ў напрамку, вызначаным рашэннямі XXIV з'езда КПСС, Пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 18 ліпеня 1972 года «Аб мерах па далейшаму ўдасканальванню вышэйшай адукацыі ў краіне».

Летась працягвалася канцэнтрацыя навуковых сіл, матэрыяльных рэсурсаў на асноўных навуковых напрамках. Іх налічваецца ўжо дзевятнаццаць.

План навукова-даследчых работ за мінулы год выканан. Па гаспадарчых дагаворах было асвоена 224,6 тысячы рублёў — на 63,6 тысячы рублёў больш, чым у 1972 годзе. Найбольшы аб'ём работ на рахунку геалагічнага (70 тыс. руб.) і фізічнага (68 тыс. руб.) факультэтаў. Сярод кафедр лепшых вынікаў дабіліся кафедры агульнай геалогіі і фізікі цвёрдага цела, сіламі якіх асвоена адпаведна 60 і 51 тысяча рублёў.

З ліку закончаных тэм важнейшымі з'яўляюцца «Беларускі нарматыўна - дыялектны слоўнік», складзены на кафедры рускай і беларускай моў і прыняты выдавецтвам «Вышэйшая школа»; «Даследаванне трэння і зношвання пары ходавой вінтгайка слізгацення папярочна-стругальных станкоў на ўмовах выбіральнага пераносу», выканання на кафедры фізікі цвёрдага цела і па выніках якой сёлета на гомельскім заводзе імя Кірава праводзяцца эксплуатацыйныя выпрабаванні.

У мінулым годзе працягвалася ўкараненне вынікаў навукова - даследчых работ, выкананых у папярэднія гады. Эканамічны эфект ад іх укаранення перавысіў сто тысяч рублёў.

У Камітэт па справах вынаходніцтваў было пададзена 17 заявак на вынаходніцтвы. Атрыманы два аўтарскія пасведчанні і адно станоўчае рашэнне. За год з друку выйшла 11 кніг і зборнікаў агульным аб'ёмам сто друкаваных аркушаў. У часопісах было змешчана 145 навуковых артыкулаў.

Актывізавалася навукова-метадычная работа па ўдасканальванню вучэбнага працэса. У канцы мінулага года была праведзена першая навукова-метадычная канферэнцыя па актуальных пытаннях вышэйшай школы, матэрыялы якой будуць выдадзены сёлета.

Прыкметны рост навуковай кваліфікацыі кадраў. Выконваючая абавязкі дацэнта кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлы Д. В. Нікалаева паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю. Для завяршэння доктарскай дысертацыі на пасаду старшага навуковага супрацоўніка пераведзен А. І. Павук. Летась сем выкладчыкаў універсітэта паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі і дзесяць — прадставілі да абароны.

Павысілася эфектыўнасць аспірантуры. З дзесяці яе выпускнікоў шэсць у тэрмін прадставілі да абароны дысертацыі. Расшырыўся састаў спаборнікаў на атрыманне вучонай ступені. Да ўніверсітэта летась было прымацавана 239 спаборнікаў, 76 з іх — выкладчыкі ГДУ.

Працягвалася пашырэнне і ўмацаванне матэрыяльна - тэхнічнай базы навуковых даследаванняў. Закончана наладка і ажыццёўлены запуск ЭВМ «Мінск-32», набыты электронны мікраскоп і іншае абсталяванне. Наладжана метэаралагічная служба.

У мінулым годзе значна актывізавалася навуковая работа студэнтаў. 73 працэнты іх саставу на дзённым аддзяленні займаліся ў гуртках СНТ. На рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых прац па прыродазнаўчых і гуманітарных навуках было прадстаўлена 92 работы, на ўсесаюзны конкурс — 44. Студэнтамі самастойна і ў сааўтарстве апублікавана 25 навуковых даследаванняў. На ўсесаюзным конкурсе адна работа ўдастоена дыплома Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і ЦК ВЛКСМ.

Аднак, побач з пэўнымі дасягненнямі ў навукова-даследчай рабоце, мелі месца і істотныя недахопы. Так, на кафедрах гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі, тэарэтычнай фізікі, хіміі і некаторых іншых не пераадолена шматтэмнасць. Яшчэ слабай застаецца і матэрыяльна - тэхнічная база навуковых даследаванняў. Кошт навуковага абсталявання складае каля 30 працэнтаў ад кошту ўсяго лабараторнага абсталявання ўніверсітэта, прычым каля 20 працэнтаў прыпадае на ЭВМ «Мінск-32».

Не праявілі належнай актыўнасці дэканат фізічнага факультэта і кафедра фізікі цвёрдага цела ў пытанні арганізацыі галіновай лабараторыі па фізіка-хімічнай механіцы працэсаў трэння.

Арганізацыя навукова-даследчай работы кафедр застаецца яшчэ нізкай. На шэрагу кафедр не працуюць навуковыя семінары, недастатковы кантроль за выкананнем плана навуковай працы. Многія кафедры парушаюць тэрміны прадстаўлення навуковых справаздач. Маюць месца недахопы і ў планаванні навуковай працы.

Нельга мірыцца і з тым, што яшчэ застаецца нізкай эфектыўнасць навуковых даследаванняў. Шэраг тэм выконваецца не на ўзроўні вынаходніцтваў, у выніку чаго мала падаецца заявак у Камітэт па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў. Ёсць выпадкі няякаснага выканання гаспадарча - дагаворных тэм.

Па выніках навукова-даследчай работы мала выдаецца фундаментальных прац: манаграфій, кніг, вучэбных дапаможнікаў. Недастаткова друкуецца таксама артыкулаў у цэнтральных навуковых часопісах.

Шэраг кафедр не прымае неабходных мер да далучэння ў навукова-даследчую работу малодшага выкладчыцкага саставу, для забеспячэння яго навуковага і кваліфікацыйнага росту.

Мы павінны дабіцца вышэйшай эфектыўнасці і ад нашай аспірантуры. Кафедры, навуковыя кіраўнікі павінны палепшыць работу па адбору кандыдатур у яе . Большага кантролю патрабуюць да сябе самі аспіранты. Пры іх атэстацыі нельга дапускаць лібералізму, як гэта здаралася ў нас.

Да апошняга часу не адчувалася ініцыятывы Савета маладых вучоных у павышэнні актыўнасці маладых выкладчыкаў і аспірантаў.

Кафедры і факультэты яшчэ недастаткова ўдзялялі ўвагу распрацоўцы праблем педагогікі і методыкі выкладання ў вышэйшай школе. Ва ўніверсітэце пакуль што няма каардынацыйнага Савета па распрацоўцы праблем вучэбна - выхаваўчага працэсу ў вну.

На ўсе гэтыя недахопы ў арганізацыі навукова - даследчай работы сур'ёзная ўвага была звернута на пасяджэнні Вучонага савета ўніверсітэта. Перад калектывам навуковых супрацоўнікаў ГДУ пастаўлена задача ў адказ на Зварот Цэнтральнага Камітэта КПСС да партыі, да савецкага народа сканцэнтраваць усе свае намаганні на паспяховым выкананні планаў вызначальнага года пяцігодкі.

Кафедрам і факультэтам трэба заняцца вырашэннем фундаментальных праблем, якія маюць вялікае народнагаспадарчае навуковае значэнне. Свае сілы і і матэрыяльныя рэсурсы нам неабходна сканцэнтраваць на галоўных напрамках, якія адпавядаюць профілю спецыялістаў, рыхтуемых ва ўніверсітэце. Кафедры, якія не маюць асноўных навуковых напрамкаў, абавязаны ўстанавіць сувязі з праблемнымі Саветамі АН БССР і вызначыць комплексныя праблемы даследаванняў.

Пры распрацоўцы плана навукова-даследчых работ на 1976—1980 гады трэба прыняць меры для далейшай канцэнтрацыі навуковых сіл і сродкаў.

Вучоны савет універсітэта абавязаў дэканат фізічнага факультэта і кафедры фізікі цвёрдага цела не пазней, чым да першага мая г. г. распрацаваць прапановы аб адкрыцці галіновай лабараторыі па праблемах фізіка-хіміі працэсаў трэння.

Вучоны савет палічыў мэтазгодным устанавіць на факультэтах пасады грамадскіх намеснікаў дэканаў па навуковай рабоце.

Ад навукова - даследчага сектара запатрабавана ўзмацніць кантроль за выкананнем гаспдагаворных тэм і не дапускаць залічэння на пасады па НДСу асоб выкладчыцкага саставу, якія не вядуць або не выконваюць планаў навуковай працы па дзяржбюджэту.

У прынятым Вучоным саветам рашэнні прадугледжваецца пры падборы на выкладчыцкую работу кадраў і пры перавыбранні іх на новы тэрмін улічваць магчымасць навуковага росту і ўдзелу ў навукова-даследчай працы кафедр на асноўных напрамках.

Цяпер прымаюцца меры для далучэння ў актыўную навуковую працу маладых выкладчыкаў, ім аказваецца больш істотная дапамога ў вызначэнні тэматыкі і навуковага кіраўніцтва.

Прымаюцца таксама меры для ўхілення іншых недахопаў, якія мелі месца ў навукова-даследчай працы, пры падрыхтоўцы спецыялістаў. Усё гэта падпарадкавана мэце паспяховага выканання тых вялікіх і адказных задач, якія стаяць цяпер перад вышэйшай школай краіны і, у прыватнасці, перад нашым універсітэтам.

---

**50-ГОДДЗЮ ПРЫСВАЕННЯ КАМСАМОЛУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, 30-ГОДДЗЮ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА**

## ПАЛАЖЭННЕ

### АБ ПРАВЯДЗЕННІ АГУЛЬНАЎНІВЕРСІТЭЦКАГА АГЛЯДУ-КОНКУРСУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

**Агляд-конкурс праводзіцца камітэтам ЛКСМБ, прафкомам, клубам мастацкай самадзейнасці ўніверсітэта з мэтай далейшага развіцця творчых здольнасцей юнакоў і дзяўчат, павышэння ідэйна-мастацкага ўзроўню самадзейных калектываў, стварэння на аснове фальклорнага матэрыялу новых мастацкіх твораў.**

**УМОВЫ АГЛЯДУ:**

**1. Удзел у аглядзе-конкурсе павінны прымаць толькі студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта.**

**2. Удзельнічаць могуць вакальна-інструментальныя, вакальныя і інструментальныя ансамблі, харавыя і танцавальныя калектывы, салісты, чытальнікі.**

**3. Калектывы-ўдзельнікі павінны прадставіць на конкурс праграму з 3—4 твораў. Для салістаў і чытальнікаў — па 2 творы, для танцавальных калектываў — 2—3 танцы, для астатніх:**

**— адзін твор камсамольскай тэматыкі;**

**— адзін твор патрыятычнага характару;**

**— адзін твор па выбару.**

**4. Удзельнікі аднаго мастацкага калектыву могуць быць студэнтамі розных факультэтаў.**

**Заявы на ўдзел у аглядзе-конкурсе, са спісам праграмы, прадстаўляюцца адказным за культмасавую работу на факультэтах, у камітэт ЛКСМБ ГДУ да 15 красавіка 1974 г.**

**Пераможцаў чакаюць каштоўныя падарункі і граматы.**

**Конкурс будзе праводзіцца ў актавай зале ГДУ з 26 па 28 красавіка.**

**Састаў журы будзе аб'яўлены дадаткова.**

**КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ, КЛУБ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ГДУ.**

---




# ГЭТАГА ПАТРАБУЕ ЖЫЦЦЁ

У нашай камсамольскай арганізацыі адбыўся чарговы сход. На яго парадку стаяла пытанне: «Галоўная задача камсамольскай арганізацыі вну — падрыхтоўка высокакваліфікаванага спецыяліста».

На сходзе вялася дзелавая размова аб ганаровых абавязках камсамольскай арганізацыі факультэта ў ажыццяўленні гэтых адказных патрабаванняў, якія пастаўлены перад вышэйшай школай. Ва ўсіх выступленнях адчувалася заклапочанасць камсамольцаў аб тым, каб на мехмаце рыхтаваліся высокакваліфікаваныя спецыялісты для вытворчасці і народнай асветы.

У прыватнасці, на сходзе адзначалася, што сучасны спецыяліст не ўяўляецца без глыбокіх ведаў і ўмення працаваць з людзьмі. У сувязі з гэтым турбуе той факт. што яшчэ многія студэнты здаюць экзамены на сесіях толькі на «тройкі». Таму студэнтка другога курса Л. Сусло сказала, што трэба дабівацца, каб сёння дзяржаўнай адзнакай лічылася не «здавальняюча», як мяркуюць асобныя студэнты, а не ніжэй «добра».

Другакурснік В. Сасноўскі звярнуў увагу на тое, што кіраўнік вытворчасці, савецкі педагог не можа быць паўнацэнным спецыялістам, калі ён не падрыхтаваны як агітатар, палымяны барацьбіт за ажыццяўленне рашэнняў і планаў нашай партыі. І калі асобныя студэнты яшчэ атрымоўваюць здавальняючыя адзнакі па грамадскіх навуках, дык гэта сведчыць аб слабай палітычнай загартоўцы.

На сходзе было выказана шмат прапаноў для паляпшэння работы камсамольскай арганізацыі факультэта. Так, напрыклад, выказана пажаданне як мага хутчэй укараніць і развіваць вучэбна-даследчую работу.

Хочацца выказаць спадзяванне, што дзелавое абмеркаванне важнага пытання — падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў — дазволіць паспяхова вырашыць многія праблемы ў гэтым напрамку.

**А. ЖУРАВЕЛЬ, сакратар бюро камсамольскай арганізацыі механіка-матэматычнага факультэта.**

---

# ВАРТЫ ЗАХАПЛЕННЯ

Цяжка не паддацца тым уражанням, пачуццям, якія выклікае чытанне лекцый доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара Харытановіча Фёдара Мікалаевіча. Нават назваць яго выступленні перад студэнтамі лекцыямі празаічна і казённа. Яго думкі здзіўляюць сваёй глыбінёй і яснасцю. Гэта сапраўдная сімфонія навуковых ведаў, гэта сапраўдная паэзія. Яна ўзвышае маральна, выклікае творчую актыўную дзейнасць. Кожнае паняцце аб складанай разнастайнасці прыродных працэсаў у яго глыбока прадуманае, адчутае.

Прысутнасць на яго лекцыі прыносіць вялікае задавальненне, зачароўвае магічным спалучэннем тэарэтычных ведаў з практычнымі. Неяк лёгка і свабодна складваецца яснае і акрэсленае разуменне ўсяго сказанага. Фёдар Мікалаевіч — чалавек сталага ўзросту. Але ён застаецца маладым душэўна. Гэтая маладосць у спалучэнні з энцыклапедычнымі ведамі робіць яго сапраўдным прыкладам чалавека вялікай працы.

**Студэнты 5-га курса біёлага - глебавага факультэта.**

---

# ТЫДЗЕНЬ НАВУКІ

У Беларускім інстытуте народнай гаспадаркі з 11 па 15 лютага праходзіў традыцыйны тыдзень навукі, прысвечаны 50-годдзю прысваення каамсамолу імя У. І. Леніна. Яго дэвіз — «Веды! Пошук! Адкрыцці!».

Асноўнае месца на тыдні займала студэнцкая навуковая канферэнцыя па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. Прадстаўнікамі канферэнцыі былі і студэнты нашага ўніверсітэта, эканамісты: В. Трухаў, Т. Шарыпава, І. Іванова, якія прачыталі свае даклады.

На пленарным пасяджэнні з прывітальным словам выступіў прарэктар па навуковай рабоце БІНГ, прафесар В. В. Аспалоўскі, затым былі заслуханы некаторыя даклады ўдзельнікаў канферэнцыі.

У наступныя дні праходзіла работа секцый палітэканоміі, гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковага камунізму. Вялікую цікавасць выклікалі работы, прачытаныя на секцыі палітэканоміі. У іх адчуваецца высокі тэарэтычны ўзровень аўтараў, яркае адлюстраванне рашэнняў XXIV з'езда партыі, снежаньскага Пленума ЦК КПСС (1973 г.), VII сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

**І. ІВАНОВА, студэнтка другога курса эканамічнага факультэта.**

# ІМІ ГАНАРЫЦЦА ЎНІВЕРСІТЭТ



## АПЯРЭДЖВАЮЧЫ ЧАС

Сёння назавіце на эканамічным факультэце прозвішча Аляксандра Саснова, і ад кожнага (няхай гэта будзе першакурснік ці сёлетні выпускнік) пачуеце ў яго адрас пахвальныя словы.

Чым жа заслужана такое ўсеагульнае прызнанне? Нічога звышнатуральнага няма. У звычайнай абстаноўцы сярод іншых студэнтаў ён нічым асаблівым не адрозніваецца. На першы погляд здаецца нават занадта сціплым. Але калі бліжэй пазнаёміцца з Аляксандрам, дык стане зразумелым, чаму ён карыстаецца такім вялікім аўтарытэтам.

Ва ўніверсітэт А. Сасноў прышоў, атрымаўшы добрую армейскую і працоўную загартоўку. Гэта і вызначыла яго сур'ёзныя адносіны да жыцця, вучобы, той справы, якую даручаюць. І калі выбіралі першага ў гісторыі факультэта сакратара камсамольскай арганізацыі, беспамылкова назвалі Аляксандра Саснова. Ужо чатыры гады ён апраўдвае давер'е, аказанае камсамольцамі. Важак моладзі факультэта паказвае прыклад перш за ўсё ў вучобе, навукова-даследчай рабоце, у грамадскай дзейнасці, спорце. Прыгожа і шмат гаварыць ён не любіць. Яго характарызуюць дзелавітасць, прынцыповасць, патрабавальнасць як да членаў камсамольскай арганізацыі, так і да сябе...

Усіх тых спраў, якія значацца на рахунку Аляксандра Саснова за гады ва ўніверсітэце, не злічыць. Аб чым бы не ішла размова па пытаннях шматграннага студэнцкага жыцця, абавязкова ўпамінаюць і яго імя як аднаго з тых, кім ганарыцца ўвесь універсітэт. Таму ні для каго не было нечаканым, калі летась Аляксандра Саснова за выдатную вучобу, актыўную грамадскую дзейнасць і ўдарную працу ў студэнцкіх будаўнічых атрадах узнагародзілі Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Нярэдка Саша заходзіць у нашу рэдакцыю. Пра сябе не расказвае. Яго клопаты — аб факультэце. З-за сціпласці ён не вымавіў слова аб тым, што яго за выдатную вучобу вылучылі на Ленінскую стыпендыю, перавялі на індывідуальны план вучобы.

Цяпер А. Сасноў на чацвёртым курсе. Аднак ён не толькі здолеў нядаўна на «выдатна» здаць экзамены зімовай сесіі, але і разлічыўся з двума залікамі летняй. Да мая мяркуе поўнасцю прайсці ўсю праграму чацвёртага курса і здаць належныя экамены.

Выдатнік вучобы абганяе час для таго, каб падключыцца да выканання гаспадарча-дагаворнай тэматыкі на кафедры эканомікі працы. Гэта дазволіць на практыцы глыбей замацаваць тэарэтычныя веды, выпрабаваць сябе як будучага спецыяліста.

Вось такі ён — выдатнік вучобы, камсамольскі важак Аляксандр Сасноў.

**НА ЗДЫМКУ: студэнт чацвёртага курса эканамічнага факультэта Аляксандр Сасноў.**

Фота А Рудчанкі.

## ДРУЖБА СТУДЭНТАЎ

Студэнты Гданьскай медыцынскай акадэміі вось ужо некалькі гадоў падтрымліваюць кантакты з моладдзю першага Ленінградскага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга медыцынскага інстытута імя акадэміка І. П. Паўлава. Штогод у Ленінград выязджаюць 10 студэнтаў з Гданьска. Столькі ж прадстаўнікоў савецкай вну праходзяць практыку ў клініках Гданьска. Студэнты знаёмяцца з вопытам сваіх сяброў, з праграмамі навучання, работай маладзёжных арганізацый.

### Выносім на абмеркаванне

**Пра што піша студэнт дадому? Пра тое, як яму «служыцца» ў вну, тэхнікуме, — пра вучобу, пра тое, як дружыцца, і, безумоўна ж, як жывецца. І калі сын або дачка ў спешцы або наўмысна забудуць асвяціць сваё жыццё-быццё, у адказным пісьме тут жа пытанне: як там, у новым доме? Ці цёпла, ці дружна?**

**Пра што піша студэнт у студэнцкі аддзел газеты? Пра ўсё. Але рэдкі дзень не прынясе пісьма, а то двух-трох усё на тую ж тэму: «Мой інтэрнат — мой дом».**

**Што гэта—прыгожая фраза? Вядома ж не. На працягу некалькіх гадоў не мае чалавек іншага даху над галавой, а значыць, як у любым доме, у інтэрнаце павінна быць і ўтульна,і радасна. Ці ж заўсёды так на справе?**

**Мы выбралі пісьмы тыповыя, пытанні няспынныя і папрасілі адказаць на іх старшыню ЦК прафсаюза работнікаў асветы, ВШ і НУ Т. П. ЯНУШКОЎСКУЮ.**

## ДОМ, У ЯКІМ ЖЫВЕ СТУДЭНТ

**«Як вядома, дзень нараджэння бывае толькі раз у год. Ці родны дом — інтэрнат, калі нават адзіны ў годзе я не магу тут адзначыць як трэба? Даведаюцца, што сабралася кампанія, нават сваіх, хто жыве ў інтэрнаце, — непрыемнасцей не абабрацца...»**

**Студэнты гандлёва-эканамічнага інстытута.**

**«Інтэрнат — дом студэнта. А ў дом можна запрашаць сяброў. Да нас жа нават сваякоў не заўсёды прапусцяць. Не кажучы ўжо аб таварышах. Можаш прад'явіць хоць усе дакументы, — бескарысна. Кажуць: «Палажэнне аб студэнцкіх інтэрнатах такіх візітаў не прадугледжвае». Чаму?»**

**А. Н., педінстытут.**

— Спачатку некалькі слоў у абарону палажэння. Візітаў такіх яно сапраўды не прадугледжвае. Але і не забараняе. Паспрабую растлумачыць. Чаму дзейнічаюць у рамках закона тыя, хто не прапусціць праз парог ні адной пабочнай жывой душы, хто на студэнцкія імяніны наклаў вета? Таму што дзень нараджэння адзін у кожнага, безумоўна. Але калі ў інтэрнаце жывуць, напрыклад 400 студэнтаў. А там жа святы агульныя для ўсіх, і свае студэнцкія — прыезды з канікул, экзамены. Такім чынам, не менш двух свят у дзень.

Другое пытанне — і святы трэба адзначаць па-рознаму. Але гэта ўжо другая тэма, да яе можна і не дайсці, абмежаваўшыся аргументам: «Вас многа», з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі.

Што ж, не трэба быць вялікім знаўцам марфалогіі, каб вызначыць у слове «інтэрнат» два корані. Агульнае жыццё. Не мой уласны дом. Дом агульны. Нічога не зробіш—«я» тут гучыць у множным ліку, а таму кожны раз даводзіцца суразмерваць, лічыцца з астатнімі. У інтэрнаце павінна быць добра ўсім.

Толькі ці можа быць добра ўсім, калі кожнаму паасобку дрэнна? Правільна, няма ў студэнта другога даху над галавой на працягу пяці гадоў, таму пад гэтым дахам не «перамагацца» ён павінен, а жыць па-сапраўднаму, па-чалавечы.

Хвіліначку! Тут мяне можа перабіць які-небудзь адміністратар, сцвярджаючы, што для гэтага зусім не абавязкова прыводзіць сяброў у інтэрнат, і ці мала дзе можна сябрам мець зносіны, акрамя цеснай плошчы інтэрната.

У цеснаце, ды не ў крыўдзе. Мне здаецца, у прыгожы дзень аднакурснікі і самі прамяняюць чатыры сцяны на прагулку па вуліцы, паход у кіно, паездку за горад. Але ці разумна вывозіць за парог людзей у мароз і слату, не гледзячы на іх самаадчуванне, настрой, жаданне? Папіць з сябрамі, «як дома», чай, пачытаць разам вершы, паслухаць музыку, і проста па-сяброўску пагутарыць, ці такая ўжо гэта звышпатрэба?

Дык як жа быць? «Пускаць ці не пускаць?» Палажэнне аб студэнцкім інтэрнаце дае права адказаць на гэта пытанне самой адміністрацыі. І, несумненна, для адмовы павінны быць прычыны звышпераканаўчымі. Ды і зноў жа ад той адміністрацыі залежыць, каб прычыны гэтыя зусім не ўлічваць. Такі аргумент, як «студэнты не маюць асобнага памяшкання для занняткаў, і яны займаюцца прама ў сваіх пакоях, дзе наведвальнікі могуць перашкодзіць ім»,—безумоўна, аргумент, але, на маю думку, разумней не перакрываць уваходы і выхады ў інтэрнат, а лепш падумаць аб стварэнні гэтага пакоя. Памяшканне для занняткаў — не раскоша. Неабходнасць.

Ці другі варыянт. У інтэрнаце Маскоўскага інстытута нафтахімічнай і газавай прамысловасці гасцям уваход адкрыты. Паднімацца ў пакоі лічыцца немэтазгодным, затое ёсць спецыяльныя холы, дзе пасядзець з сябрамі адно задавальненне, утульна, прыгожа, кветкі...

Разумеецца, адчыняючы для гасцей дзверы інтэрната, і ад саміх гаспадароў патрабаванне асаблівае. Аднак, думаецца, для выхавання пачуццяў адказнасці ў чалавеку давер'е куды больш дабратворная глеба, чым забарона і адміністраванне.

**«Праводзілі аднакурсніка ў армію. Цягнік адыходзіў у гадзіну ночы. У палове другой мы былі ў інтэрнаце, але нас не пусцілі ў наш дом: пасля адзінаццаці ўваход забаронен. Ісці ў кіно на дзве серыі таксама не можам. Спазніўся на пятнаццаць мінут—гуляй да раніцы па горадзе».**

**Навучэнцы геолагаразведачнага тэхнікума.**

— Безумоўна, студэнт, які жыве ў інтэрнаце, павінен разумець, што глядзець яму фільм лепш на сеансе хаця б перадапошнім. Відавочна, аўтары пісьма гавораць ўсё ж не пра сістэму, калі спазненне ў парадку рэчаў, а аб выключэнні. Не так часта праводзяць аднакурснікаў у армію. Таму нічога страшнага не адбылося б, калі рабяты, папярэдзіўшы, безумоўна, загадзя аб сваёй затрымцы, вярнуліся ў інтэрнат пасля ўмоўленага часу.

Не было такога папярэджання? Падобнае паўтараецца часта? Што ж, у інтэрнаце свае правілы, і за парушэнне іх студэнт можа панесці пакаранне. Але ёсць спосаб пакараць чалавека інакш. Перш за ўсё — заўтра паведаміўшы, напрыклад, аб інцыдэнце ў студсавет. Нікому не дадзена права пакідаць студэнта начаваць за парогам дома. І вельмі дзіўна, што ёсць людзі, якія самі сябе на падобнае ўпаўнаважылі. «Паўнамоцтвы» гэтыя прымаюць часам вельмі дзівосныя формы.

**«У нашым інтэрнаце адміністрацыя вырашыла ўзвесці перагародку паміж мужчынскай і жаночай палавінамі».**

**Навучэнцы электратэхнікума сувязі.**

Думаецца, не трэба было рабіць гэтага, па-першае, з-за меркаванняў пажарнай бяспекі. А па-другое, за прыватным выпадкам хаваецца праблема больш сур'ёзная — праблема адміністрацыйнай раз'юшанасці, калі ўжо не ставіцца пытанне: разумна — ці не разумна, галоўнае—я так хачу.

Вось яшчэ тры пісьмы:

**«Камендант, заўважыўшы студэнтку з хлопцам, прымушае яе мыць падлогу на паверхах, сцвярджаючы, што сустрэч ім упаўне дастаткова ў кіно і тэхнікуме».**

**«У нас у тэхнікуме ўведзена самападрыхтоўка. У гэты час выкладчыкі ходзяць па пакоях і адзначаюць усіх, хто не выйшаў «на работу». Але ж калі чалавек хоча вучыцца, ён і без таго займаецца. Паспяховасць нашай групы з новаўвядзеннем не палепшылася, а вось на характар рабят вельмі здорава паўздзейнічала: нас палохаюць «чорнай кнігай», высяленнем з інтэрната, аператыўкай...»**

**Навучэнцы індустрыяльнага тэхнікума.**

**«Аднойчы мне нездаровілася (я наогул часта хварэю). У гэты дзень я засталася ў ложку і адпаведна не пайшла на заняткі. Раптам адчыняюцца дзверы, заходзіць увесь наш актыў і яшчэ незнаёмы хлопец з фотаапаратам. Рэйд-праверка наведвання заняткаў.**

**Я кажу: «Рабяты, перш чым фатаграфаваць мяне, даведайцеся прычыну. І наогул нельга чалавека здымаць у такім выглядзе». Праз два дні я змагла пайсці на заняткі, і першае, што ўбачыла — на ўсю сцяну газета, і мой партрэт». Н. Б.**

— Аўтары «задумак» у кожным выпадку розныя — камендант, педагогі, самі студэнты. Дзеянні свае ўсе яны лічаць упаўне законнымі, і логіка тут прыкладна такая: «Раз ты жывеш у інтэрнаце, ты сабе ўжо не належыш, і гэта аўтаматычна дае нам права рабіць усё, што мы лічым патрэбным» Але чаму? Хто сказаў, што ў калектыве чалавек перастае быць асобай?!

Няхай жыве барацьба за павышэнне дысцыпліны і паспяховасці! Але як, якімі сродкамі яна вядзецца?І тут пытанне пераступае «парог» студэнцкага інтэрната і ўваходзіць у сферу наогул людскіх адносін, чалавечага агульнажыцця. Але ў нашым выпадку гучыць яно асабліва востра, таму што некалькі гадоў жыцця чалавек фактычна заўсёды на людзях, кожны крок яго на відавоку. І для таго, каб лягчэй жылося «на міру», трэба старацца быць да чалавека добрым і папераджальным. Вечнае абмежаванне студэнта, бястактнасць у адносінах да яго — зусім не абавязковы прыдатак да ордэра на ўсяленне ў інтэрнат.

**«Мне не хочацца ганьбіць свой інстытут, таму не падпісваюся. Але растлумачце, ці мае рацыю камендант нашага інтэрната, сцвярджачы, што ён у вну трэці чалавек пасля рэктара і прарэктара. А студсавет тут — нішто?».**

— Няхай прабачаць мяне студэнты, але дрэнны камендант там, дзе дрэнны студсавет. Студсавет — «галоўны чалавек» у інтэрнаце. Яму дадзена права вырашаць усе пытанні, звязаныя з арганізацыяй працы і быту студэнтаў у сваім доме. Яго распараджэнні, зацверджаныя рэктарам, — гэта кіраўніцтва для адміністрацыі, у тым ліку і каменданта. І там, дзе студсавет працуе па-дзеламу, пытанняў, падобных тым, што ўтрымліваюць нашы пісьмы, не ўзнікае. Зайдзіце ў інтэрнат МАІ, і вы ўбачыце, што студэнт там не «як дома», ён проста—дома. І быт тут наладжаны так, што і кожнаму добра, і ўсім не цесна.

«Але ў нашага студсавета правы толькі на паперы», — не здаюцца аўтары многіх пісем. Адзінае, што можна адказаць, — гэта або студсавет усё ж не ведае сваіх праў, або проста не ўмее імі карыстацца. Тады адно пытанне: ці ў кож-

**(Заканчэнне на 4-й стар.)**

# ДОМ, У ЯКІМ ЖЫВЕ СТУДЭНТ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

ным інстытуце ўключан у савет ВНУ прадстаўнік студэнцкага прафкома — чалавек, які знаходзіцца ў курсе ўсіх падзей, праблем і клопатаў інтэрната? Далёка не ў кожным, а ўваходзіць туды ён павінен, прычым з правам рашаючага голасу. Бо не толькі з камендантам, але і з рэктарам там рашае студсавет, як жыць інтэрнату, што дазволіць жыхарам, чаго патрабаваць ад іх. Дом студэнта — падраздзяленне інстытута, і, думаецца, рэктарат зацікаўлен у стварэнні добрага клімату ў інтэрнаце не менш, чым у нармальнай рабочай абстаноўцы ў вучэбных корпусах.

У каменданта свае абавязкі. Яго работа — забяспечыць студэнта тым, што неабходна ў быце. Адрамантаваны пакой, чыстыя ложкі, настольныя лямпы — пра гэта павінен клапаціцца камендант. З яго мае права спытаць студсавет, калі гэтага ў студэнтаў няма. Ручнікоў няма — чаму? Няма ў запасах? Значыць, грошы, якія выдзяляліся на набыццё ручнікоў, выкарыстоўваюцца не па назначэнню. Або магчыма, проста валакіта? Студсавет абавязаны не толькі кваліфікавана прааналізаваць становішча спраў, але і дабіцца вынікаў.

Аднак, сцвярджаючы, што студсавет гаспадар у інтэрнаце, нельга забываць, што і ты, студэнт, тут не госць. Інтэрнат называюць домам яшчэ і таму, што становіцца ён ім у той меры, у якой сам чалавек у гэтым зацікаўлены.

**«Вада ў нас у інтэрнаце ідзе толькі халодная. Ды і то не заўсёды. Нярэдка раніцай даводзіцца ісці ў вучылішча непамытымі».**

**Студэнты педагагічнага вучылішча.**

— Я не ведаю, можа, і ёсць у даным выпадку звышпрычыны. Але ўсё ж хіба ў рабят адзіная надзея — на дапамогу збоку? Што, з Масквы ваду прысылаць? Або можна ўстанавіць бакі для збору вады дзе-небудзь у Нікалаеўску-на-Амуры?

Яшчэ радкі: няма дзе займацца, няма пакоя для заняткаў. Але ці так складана прагуляцца па паверхах, паглядзець — ці не знойдзецца памяшканне, застаўленае старымі ложкамі, заваленае матрацамі? А можа, трэба проста зламаць перагародку, і з двух пакояў зрабіць адзін, большы, для заняткаў, а самім адпаведна пацясніцца ў жылых памяшканнях.

Пад ляжачы камень вада не цячэ. Ісціна старая, але вось яшчэ дзве ілюстрацыі. Калісьці ў Бельцкім педінстытуце прыезд маці, брата таксама разрастаўся ў невырашальную праблему. Рады прыняць, ды няма куды.

Стаяў на тэрыторыі студгарадка стары дом. Знесці хацелі, а тут студэнты. Дабіліся ад гарадскіх улад дазволу на рамонт, самі прывялі ў парадак — і няма праблемы. Затое ёсць дом прыезджых.

Або інтэрнат Ленінградскага караблебудаўнічага інстытута. Тут даўно знята пытанне, дзе прыняць сяброў. Ёсць клубы, залы, холы. Зусім нядаўна іх яшчэ не было. Хто ж архітэктары і майстры? Студэнты, разумеецца, караблебудаўнікі...

**«Скажыце, колькі ў інтэрнаце можа размяшчацца чалавек на адзін метр плошчы? Я не агаварылася: не метраў на чалавека, а чалавек на метр... Жывем у маленькім пакоі ўшасцёх. Якое заўтра ў студэнцкіх інтэрнатаў?»**

**«У нашым інтэрнаце каля 250 чалавек. І ўсяго 5 электрычных разетак. Як пагаліцца раніцай? Зрабілі разеткі ў сваіх пакоях. Захоўваючы, натуральна, усе правілы тэхнікі бяспекі — усё ж будучыя электрыкі.**

**Разеткі забралі і паабяцалі, што ў наступны раз за такое з інтэрната выселяць».**

**Навучэнцы палітэхнікума**

— Нават не будучым, сапраўдным электрыкам не варта ў сябе дома займацца падобнай самадзейнасцю. Для гэтага ёсць манцёр. Ва ўсякім выпадку камендант, які абавязан пры неабходнасці яго выклікаць. А неабходнасць відавочная. У адпаведнасці з нормамі адна разетка павінна быць у кожным пакоі. Як мінімум.

Дарэчы, яшчэ лічбы. На кожнага студэнта трэба не менш 6 кв. метраў плошчы. Аднак, з дазволу санэпідстанцыі, дапушчальна нормы да чатырох з палавінай метраў. Нічога не зробіш, даводзіцца пацясніцца, надта многім студэнтам патрэбен інтэрнат. Задаволіць усіх пакуль што мы не можам.

Дырэктывамі дзевятага пяцігадовага плана прадугледжана значнае пашырэнне сеткі студэнцкіх інтэрнатаў. Будаўніцтва вядзецца велізарнае. І якія будуюць дамы, прыгожыя, сучасныя. Уласна, не дамы нават, а цэлыя комплексы для студэнтаў — са сваімі сталовымі, кафэ, камбінатамі бытавога абслугоўвання. Ды і самі «кватэры» таксама будуць мала падобнымі на цяперашнія. Планіроўка такая: ячэйка — два-тры пакоі са сваім санвузлом, кухняй. Зусім хутка студэнты Казанскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Чалябінскага палітэхнічнага інстытута справяць наваселлі... А студэнты Маскоўскага інстытута сталі і сплаваў, Куйбышаўскага педагагічнага інстытута ўжо адсвяткавалі іх.

Будуць наваселлі і больш скромнымі. Кожная ВНУ, тэхнікум выбірае для сябе праект па сродках. Калі за адны і тыя ж грошы інстытут можа пабудаваць не інтэрнат — палац, у якім хопіць месца толькі палове жадаючых, дык разумней пабудаваць дом больш скромны, але так, каб не пакрыўдзіць нікога. Але гэта таксама, зусім як дома, у маці з бацькам. Усім хацелася б асобны пакой, але гэта яшчэ заўтра...

(У перакладзе на беларускую мову перадрукавана з газеты «Комсомольская правда», № 42 за 19 лютага 1974 г.)

**АД РЭДАКЦЫІ: выносячы гэту публікацыю «Комсомольской правды» на абмеркаванне, мы просім студэнтаў, членаў студсаветаў, прафсаюзных і камсамольскіх актывістаў, усіх тых, хто мае непасрэднае дачыненне да інтэрнатаў, выказаць па закранутых пытаннях асабістыя думкі, прапановы. Ці стаў інтэрнат сапраўдным домам для нашых студэнтаў? Калі яшчэ не, дык што для гэтага трэба зрабіць?**

**Дасланыя матэрыялы па гэтай тэме мы пастараемся па магчымасці змясціць на старонках нашай шматтыражнай газеты. Усе заўвагі і прапановы будуць улічаны.**

# СПОРТЛАНДЫЯ — У ЗАЛЕ ГДУ








**Дзіцячая «Спортландыя» даўно заслужыла папулярнасць. Яна выклікае вялікую цікавасць не толькі ў яе ўдзельнікаў і юных гледачоў, але нават і ў дарослых. У гэтых своеасаблівых разнастайных спаборніцтвах дэманструюць сваё майстэрства, знаходлівасць, уменне перамагаць вучні ўсіх узростаў. Не выпадкова кожнае практыкаванне суправаджаецца дружнымі апладысментамі «балельшчыкаў», а пры неўдачы — падбадзёрваючым, здаровым смехам.**

**Другі год запар міжабласныя гульні «Спортландыі» праводзіліся ў спартыўнай зале нашага ўніверсітэта. На гэты раз за перамогу сапернічалі каманды гомельскай СШ № 19 і школы-інтэрната з горада Віцебска. Перамаглі гамяльчане. Аднак галоўны вынік не ў ачках, а ў тым сяброўстве, якое завязваецца паміж рабятамі ў час такіх сустрэч.**

**НА ЗДЫМКАХ (злева направа): 1. Юныя гамяльчане выконваюць песню пра свой родны горад. 2. Практыкаванне акрабатаў. 3. За ходам паядынкаў уважліва сачылі ганаровыя госці «Спортландыі», алімпійскія чэмпіёны, заслужаныя майстры спорту, гімнастка Тамара Лазаковіч з Віцебска і выкладчык ГДУ Леанід Гейштар.**

Фота А. Рудчанкі.

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

## ПЕРАМОГА ЛЫЖНІКАЎ

На працягу трох дзён у раёне г. Лагойска, што на Міншчыне, праходзілі спаборніцтвы па лыжных гонках сярод студэнтаў. За перамогу змагаліся зборныя каманды дзевятнаццаці вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Асноўная барацьба за пераходны кубак Белсавета СДСТ «Буравеснік» разгарнулася паміж пераможцамі мінулагодніх спаборніцтваў студэнтамі Беларускага інстытута фізкультуры і Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У вострай канкурэнцыі гамяльчане здолелі на адно ачко апярэдзіць сваіх грозных сапернікаў і заваявала ганаровы трафей.

У мужчын вызначыўся студэнт ГДУ Мікалай Станскі. Ён стаў чэмпіёнам на 30-кіламетровай дыстанцыі і другім прызёрам на 15-кіламетровай, а таксама дапамог сваёй камандзе заваяваць трэцяе месца ў эстафеце 4×10 кіламетраў.

У групе дзяўчат чэмпіёнкай на 5-кіламетроваай дыстанцыі стала выхаванка ГДУ Валянціна Сазонава, а яе сяброўка па камандзе Вера Сараева паднялася на другую прыступку п'едэстала гонару пасля стартаў юніёрак на 10 кіламетраў.

Сярод юніёраў у гонках на 15 і 20 кіламетраў вызначыліся гамяльчане Веніямін Багданаў і Аляксандр Лазовы. Першы з іх заняў адпаведна другое і чацвёртае месцы, а Аляксандр на абедзвюх дыстанцыях быў з трэцім вынікам.

У групе юнакоў вызначыўся брат Мікалая Станскага — Пётр. Ён заваяваў другое месца на 5-кіламетровай дыстанцыі, а на двойчы большай быў чацвёртым.

Сярэбраным прызёрам у эстафетнай гонцы 4×5 кіламетраў стала жаночая каманда.

## РЭКОРДЫ НАДЗЕЖДЫ БОЛАТАВАЙ

Ужо стала традыцыйным, што на многіх спаборніцтвах студэнцкага таварыства «Буравеснік» асноўная барацьба за перамогу раз гараецца паміж камандамі Беларускага інстытута фізічнай культуры і Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Не быў выключэннем і чэмпіянат на блакітных дарожках, у якім ўдзельнічала 150 плыўцоў трынаццаці спартыўных клубаў ВНУ рэспублікі.

У гэтых спаборніцтвах гамяльчане набралі 362,5 ачка і ў камандным заліку толькі на паўачка апярэдзілі сваіх пастаянных грозных сапернікаў — спартсменаў ІФК.

Асабліва вялікага поспеху дабілася студэнтка ГДУ майстар спорту Надзежда Болатава, якая абнавіла тры рэспубліканскія рэкорды таварыства. На спіне яна праплыла 100 метраў за 1 мінуту 15 секунд, 200 — за 2 мінуты 41,2 секунды. Трэці рэкорд Надзежда ўстанавіла ў комплексным плаванні на 400 метраў, затраціўшы на гэтую дыстанцыю 5 мінут 56,6 секунды.

Мужчынская каманда ГДУ была першай у камбінаванай эстафеце 4×100 метраў.

Праз некалькі дзён зноў у Мінску гамяльчане прымуць удзел ў спаборніцтвах плыўцоў студэнцкіх спартыўных клубаў краіны.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

## СПАРТАКІЯДА НАБІРАЕ ТЭМПЫ

Адбылося ўрачыстае адкрыццё круглагадовай універсітэцкай спартакіяды студэнтаў. Пераможцаў ужо вызначылі стралкі. Нечакана для ўсіх мацнейшай на агнявым рубяжы была каманда эканамістаў.

У барацьбу за першынство ўключыліся і валейбалісты.

Аб выніках першых відаў праграмы спартакіяды чытайце ў наступным нумары нашай газеты.

### ПАПРАЎКА

У папярэднім нумары нашай газеты дапушчана недакладнасць. У апошнім абзацы першай колонкі артыкула «Мара акрыляе» трэба чытаць: «...актыўна рыхтуюцца да XVII з'езда ВЛКСМ».

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

АЗ 00106 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Фармат — 300×420 мм. Тыраж 2000 экз. Заказ 1635